# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР 19 ВЕРАСНЯ № 21 (1685)


**Курсы па грамадска-палітычных дысцыплінах даўно састарэлі. Большасць выкладчыкаў не спяшаюцца развітвацца з застойным мінулым — па старых звычаях, яно больш надзейна. Сярод студэнтаў выдатнікі ў недаўменні — як рыхтавацца да экзаменаў, калі прамоўцы новага мыслення не спяшаюцца выкладаць свае гістарычныя і палітычныя канцэпцыі ў выглядзе падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў; двоечнікі, як заўсёды, арыентуюцца першымі — здаюць палітычную гісторыю літара ў літару па падручніку «Гісторыя КПСС».**

**А тым часам курсы перайменоўваюць: палітalогія, гісторыя філасофскай думкі, эканамічная тэорыя. Як усё ж падобны мы да нашых продкаў, якія мянялі захварэўшаму імя, каб злыя духі пакінулі яго...**



## Чаму мы, так моцна любілі яго?

**Поколение «Х»,**
**поколение «О».**
**Мы странны, нас узнать**
**можно с первого взгляда.**
**Мы забыли про боль,**
**перекатная голь.**
**Я не знаю, кому из нас**
**здесь еще что-нибудь надо.**



**Навошта вяселлю горыч?**
**І як запомніць гэты асаблівы дзень на ўсё жыццё?**
**Шукайце адказы на 4-й старонцы.**

**КАНФЕРЭНЦ-ЗАЛА**

# Якой быць гуманітарнай адукацыі?



Ці можна весці пытанні адукацыі, закрываючы вочы на змены ў ідэалагічнай і палітычнай структуры нашага грамадства? Між тым, выкліканая гэтымі зменамі перабудова дысцыплін сацыяльна-палітычнага цыкла і ў цэлым гуманітарнай адукацыі прытармажваецца не толькі адсутнасцю пэўных навуковых канцэпцый, але і супрацьстаяннем даволі значнай часткі выкладчыкаў грамадскіх кафедр.

Рэакцыя на рашэнне калегіі ад 26 жніўня гэтага года, па меркаванню прадстаўнікоў Міністэрства народнай адукацыі, — таму пацвярджэнне.

На прэс-канферэнцыі, якая пачалася з аналізу лістоў, што дасланы і ў рэдакцыі газет, і ў Міністэрства, на пытанні прадстаўнікоў рэспубліканскіх і шматтыражных газет адказвалі: намеснік міністра, прафесар **Васіль Пятровіч СТАЎРОЎ**, начальнік галоўнага ўпраўлення вышэйшай школы, прафесар **Васіль Іванавіч СТРАЖАЎ**, начальнік аддзела выкладання грамадскіх навук, дацэнт **Васіль Фёдаравіч КУШНЕР**.

**— Ці вынікае з рэкамендацыі калегіі аб пераглядзе статусу абавязковых дысцыплін сацыяльна-палітычнага цыкла, што гуманітарным дысцыплінам пакінута месца на задворках вышэйшай і сярэдняй адукацыі?**

— Хутчэй наадварот. Мы раім уводзіць новыя курсы па нацыянальнай гісторыі, мове, культуры. Аб'ём гадзін на гуманітарную падрыхтоўку не скарачаем: гэта 25 працэнтаў для негуманітарных спецыяльнасцей і 35 працэнтаў для гуманітарных. У вышэйшай школе рэспублікі назіраецца і такая пераарыентацыя: калі ў 1987 годзе на гістарычныя спецыяльнасці прымалася 350 чалавек, то ў 1991 пры агульным скарачэнні набору ў ВНУ на 25 працэнтаў — 550. Мы не прапануем скопам закрываць грамадскія кафедры. Хоць не выключана, што ў якой-небудзь з навучальных устаноў і з'явіцца такое рашэнне вучонага савета.

**— Перавод сацыяльна-палітычных дысцыплін у разрад факультатыўных супярэчыць сусветнай практыцы і можа прывесці да неканвертаванасці нашага дыплома...**

— Між тым, ці быў калі-небудзь наш дыплом канвертаваным? Скажам, вышэйшая адукацыя савецкага інжынера лічыцца роўнай навучанню на працягу ад 4 да 7 семестраў заходнегерманскага універсітэта. Але ж, паверце, гэта ніяк не звязана з аб'ёмам вывучаемых грамадскіх дысцыплін, бо сярод адпаведных патрабаванняў да якасці адукацыі нават не існуе такога крытэрыя ацэнкі.

**— Колькі ў рэспубліцы выкладчыкаў грамадазнаўцаў?**

— 1450 выкладчыкаў вышэйшых і 800 — сярэдніх навучальных устаноў. Рэалізацыя рашэння калегіі Міністэрства народнай адукацыі будзе ажыццяўляцца толькі ў межах закона. Да таго ж, аб'ём гуманітарнага навучання не скарачаецца, а сярод выкладчыкаў на некаторых кафедрах да 30 працэнтаў людзей пенсійнага ўзросту.

**— І ўсё ж, што рабіць цяпер дзвюм тысячам выкладчыкаў, якія апынуліся пад пагрозай застацца беспрацоўнымі? Як будзе выкарыстоўвацца высокі патэнцыял грамадскіх кафедр?**

— Так, адносіны да рашэння калегіі вельмі супярэчлівыя, часам і крытыка аб'ектыўная. Мы б прасілі кіраўнікоў вышэйшых навучальных устаноў не спяшацца пакуль з расфарміраваннем кафедр. Спачатку трэба вызначыць, якія спецыяльнасці патрэбны з улікам сітуацыі на кафедрах, новых навуковых распрацовак. У абсалютнай большасці кіраўнікоў цвярозы падыход да гэтага пытання, ёсць адказнасць і за канвертаванасць дыплома, і за ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў, і за лёс кадраў. Але ёсць і перагібы. Адукацыя ніяк не можа быць дэпалітызаванай, таму што палітызаваная дзяржава. Грамадазнаўцам, якія ў стане падрыхтаваць уласныя курсы лекцый, паспяваць за імклівымі зменамі ў грамадстве, няма чаго баяцца. Сёння вядзецца размова не аб абавязковых дысцыплінах, а аб цыклах па грамадскіх навуках. Мы прыходзім да высновы, што ў кожнай ВНУ павінны вывучацца дысцыпліны філасофскага цыкла — гэта можа быць дыялектыка і тэорыя пазнання, гісторыя філасофіі Беларусі, сусветнай філасофіі. Я не ўяўляю сабе спецыяліста, які не валодае эканамічнай тэорыяй. Выбар, дарэчы, робяць самі навучальныя ўстановы, зыходзячы з таго, якія ёсць кадры, што прапаноўваюць студэнты.

**— Што рабіць аспірантам?**

— Іх лёс вельмі складаны. Асабліва тых, хто трэці год займаецца па спецыяльнасці гісторыя КПСС ці палітэканомія сацыялізму. У многіх выпадках гэта акалічнасць, якая не залежыла ад аспірантаў. Калі тэма актуальная і ў сённяшні час, трагедыі, зразумела, можна пазбегнуць.

**— Па якіх праграмах будуць працаваць грамадазнаўцы?**

— Дзіўна, але ніколі не звярталіся ў Міністэрства народнай адукацыі ні матэматыкі, ні фізікі, ні хімікі з просьбай — дайце нам падручнік. Грамадазнаўцы ж не разлічваюць на ўласныя сілы. 11 працэнтаў з іх чытаюць курсы па старых планах, а многія студэнты рыхтаваліся да экзаменаў па падручніках, якія напісаны 20 гадоў назад.



**— Па якіх жа матэрыялах рэкамендавалі б ім рыхтавацца Вы?**

— Не выпадкова быў адменены экзамен па грамадазнаўству ў выпускнікоў сярэдніх школ. Тым самым афіцыйна прызнана, што ў краіне і рэспубліцы няма падручнікаў, якія б задавальнялі сучасныя патрэбы. Мала таго, час пісаць іх яшчэ не надышоў. І тое, што напісана два гады назад,— гэта макулатура. І няма ўпэўненасці, што напісанае сёння не спасцігне заўтра тая ж доля. Ды й што такое падручнік? Шчыт і меч для выкладчыка, які не гатовы творча працаваць, і для студэнта, якому няма часу паразважаць. Стаўку трэба рабіць на аўтарскія курсы, на творчы патэнцыял кафедр і, зразумела, на канкурэнтную барацьбу сярод выкладчыкаў.

**— Вам не здаецца, што мы — удзельнікі прэс-канферэнцыі — толькі тэарэтыкі, а праз плошчу працуюць практыкі — грамадазнаўцы універсітэта, педагагічнага і медыцынскага інстытутаў. Ім патрэбны час для стварэння аўтарскіх курсаў лекцый, пэўны базіс...**

— Вось да гэтага мы і заклікалі рэктараў тры гады назад. Прыпыніць дзейнасць грамадскіх кафедр на адзін-два семестры, вызваліць выкладчыкаў ад вучэбнай нагрузкі, даць шанц на распрацоўку новых курсаў. І, заўважце, без скарачэння фінансавання. Здавалася б, пасля гэтага выкладчыкі павінны рынуцца ў архівы, бібліятэкі, інстытут павышэння кваліфікацыі, нарэшце. Але мы павінны былі проста прымушаць выкладчыкаў здабываць веды. Дзе ж логіка? Кансерватыўнага супрацьўлення больш чым дастаткова.

На нашу думку, трагічна ўспрымаюць усе змены толькі тыя, хто здольны чытаць па падручніках, пабудаваных на аснове «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», а чалавеку творчаму, які здольны асэнсаваць ацаніць тое, што адбываецца, і прапанаваць свой пункт гледжання, ператварэння сацыяльна-палітычных курсаў у факультатыўныя, не трэба баяцца. Студэнты на яго лекцыі хадзіць будуць.

ПАЛІТЫЧНЫ КЛУБ

# Пад зялёным сцягам — за дабрабыт

**ПА ЎСІМ ВІДАЦЬ**, дэпалітызацыя нашаму грамадству пакуль не пагражае. Хутчэй наадварот. Асабліва ў «гарачых» кропках краіны.

Таму сёння мы адчыняем дзверы «Палітычнага клуба» для ўсіх, каго цікавіць палітыка.

Мусульманскі маладзёжны саюз (МСМ), адна з вядучых палітычных сіл у горных абласцях Абхазіі, існуе паўтара года. Штаб-кватэра саюза Манкаўшыры. Тут сакратар МСМ Н. Г. Цэрбуладзэ расказаў нашаму няштатнаму карэспандэнту аб дзейнасці сваёй арганізацыі:

— МСМ — арганізацыя моладзі ва ўзросце да 29 гадоў, якая заклікана адрадзіць незалежнасць абхазскіх земляў, перабудаваць палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя структуры дзяржавы Абхазія. Патрэба ў гэтым адчуваецца ўсё мацней з кожным годам, а ў 1991 годзе — з кожным месяцам.

— Як вядома, у вас 800 дзеючых і 1350 спачуваючых членаў саюза, хоць у горных раёнах не так многа моладзі. Чым можна растлумачыць такое заўзятае імкненне моладзі ўстаць пад эгіду саюза?

— Прычын мноства. Гэта і распад камсамола, і цяжкі маральны стан грамадства, і пранікненне мусульманства з суседніх Турцыі і Ірана. Але галоўная прычына — людзі згубілі веру ў ісціну. Ісціна рассыпалася за 73 гады пекла, а разам з ім прыйшлі нягоды, пакуты і смерці. Многія члены саюза, якія згубілі ідэал і сэнс жыцця, тут набылі іх зноў. Да людзей вяртаецца матэрыяльны і духоўны дабрабыт.

— Дарэчы, сярод вашых галоўных мэт — матэрыяльнае пераўладкаванне. Як сумяшчае ваша арганізацыя духоўны і вельмі людскі аспекты ў сваёй дзейнасці?

— Дзякуючы таму, што сярод палажэнняў устава большасць эканамічных, мы маем магчымасць дзейнічаць сугучна патрэбам часу. Так, МСМ з'яўляецца адным з заснавальнікаў Абхазскай свабоднай эканамічнай зоны (АСЭЗ). Саюз мае салідны матэрыяльны фонд, які падтрымліваецца прыватнымі ахвяраваннямі і даходамі з нашых эканамічных пунктаў у Сухумі, Сочы і іншых гарадах, а таксама са знешнеэканамічных гандлёвых аперацый — з Іранам.

Што да рэлігійнага аспекта нашай дзейнасці, дык яна пазбаўлена фанатызму і цемрашальства, за што папракаюць нас часам. У кожнага члена МСМ сваё, асабістае, стаўленне да Алаха. Зялёны сцяг — сімвал дабрабыту. А ён немагчымы без добрых манер, без страху перад грахом, без імкнення рабіць дабро і працаваць на зямлі. Члены нашага саюза здольныя ажыццявіць спадзяванні людзей пасля дасягнення паўнапраўнай палітычнай улады.

**І. ТАТАРЫНАЎ,**
студэнт факультэта журналістыкі.

ЗНАЁМЦЕСЯ!

# ВЫШЭЙШАЯ ПРОБА

**Пяцікурсніца факультэта журналістыкі Ларыса ЦІМОШЫК — імянны стыпендыят Саюза журналістаў БССР і Асацыяцыі ветэранаў друку «АЖУР». Мы не можам пазбавіць чытачоў магчымасці пазнаёміцца і з ёй асабіста, і з яе творамі. Тым больш, што гэта для вас яшчэ і сустрэча з «Міс Студэнткай Журналістыкі»...**

Ігар Паўлавіч, **ШМЯЛЕЎ** — ленінградскі архітэктар. Але прафесія сама па сабе яшчэ нічога не гаворыць пра чалавека. Кожны з нас па-свойму архітэктар: свайго лёсу, свядомасці, душы. Толькі адзін будуе: цаглінка сюды, цаглінка туды, і падмурак хісткі атрымліваецца. А некаторыя ўзводзяць свой храм, адчуваючы яго неабходнасць. Менавіта такія будынкі — на вечнасць — і пакідаюць у нас уражанне цэласнасці.

Не, не пужайцеся, ён не з самазваных прарокаў і лекараў. У сваім шляху да ведаў ён прайшоў усе этапы савецкай адукацыі. Толькі аднойчы імкненне да прафесіяналізму прымусіла задумацца аб правіле залатога сячэння. Усё, аказваецца, не так проста ў гэтым свеце: асобай мудрай прыроды прыгожае і гарманічнае на зямлі падпарадкоўваецца менавіта гэтай прапорцыі (3, 4, 5). Правіла заключаюць у сабе пабудовы цел мужчыны і жанчыны, фалангі чалавечых пальцаў, малекулы ДНК... Даўней гэта ведалі, хаця мы чамусьці прывыклі лічыць тыя часы ніжэйшай ступенню развіцця цывілізацыі.

**ПЫТАННЕ З ЗАЛЫ: Што нясе ў сабе сучасная архітэктура?**

— Наша тыповае будаўніцтва пазбаўлена гарманічнасці і прыгажосці. Архітэктура не можа не ўплываць на стан і псіхіку чалавека. Я думаю, не выпадкова ў раёнах навейшай забудовы людзі найбольш часта хварэюць, пастаянна адчуваюць дыскамфорт. Менавіта такія раёны найбольш небяспечныя ў плане развіцця злачыннасці. Тыповае будаўніцтва — свайго роду ўмова генацыду. А ўсё таму, што важна думаць не толькі над тым, што ты робіш, але і як.

Сапраўды, усе мы шукаем прыгожае. Але хіба можна гаварыць аб нейкай формуле прыгажосці ці падганяць яе пад адзін стандарт? Уявіце, што ўсе людзі былі б ідэальна цудоўнымі. Як пялёсткі аднной кветкі. Мы б хутка...
звар'яцелі ад гэтага. Гармонія — гэта адзінства, мера ўстойлівасці. Таму ў прыродзе няма барацьбы святла і цемры, ёсць іх садзейнічанне.

**ПЫТАННЕ З ЗАЛЫ: Ці можна гаварыць аб гармоніі ў эканоміцы, палітыцы таксама, як у медыцыне і мастацтве?**



— Гаварыць, безумоўна, можна. Але вось зрабіць... Нельга ж нічога вульгарызаваць і вырашаць задачы ў лоб.

**ПЫТАННЕ З ЗАЛЫ: Якой павінна быць існуючая ўлада, каб найбольш садзейнічаць развіццю чалавека?**

— Улада не ёсць абавязковая ўмова, і няма неабходнасці ў яе ўтрыманні.

Старажытныя сцвярджалі: вялікае — у малом, малое — у вялікім. Мы даўно згубілі гэту ніць, якая магла б праз лабірынт інтарэсаў вывесці нас адзін да аднаго. Кожны чалавек жа — частка сусветнага поля, таму важна ўсвядоміць, што твае паводзіны адлюстроўваюцца на іншых. Прыклад — практыка філіпінскіх урачоў. І сёння застаецца таямніцай, як могуць яны рабіць аперацыі без скальпеля. На самой справе, усё гэта абгрунтавана этычна: калі хворы адзін — хворыя ўсе, дрэнна аднаму — дрэнна ўсім. Філіпінцы робяць аперацыі на ўзроўні свайго ментальнага апарата, гэта значыць на сабе, мяняючы структуру свайго поля, а значыць і структуру поля другога чалавека, які таксама ёсць частка цябе. Але наколькі свядомасць — гэта сусветнае поле, больш да месца пытанне: а ці трэба гэтага хворага лячыць? Са смерцю ж чалавека (цялеснай структуры) тое, што з'яўляецца яго дзеючым пачаткам, не памірае. На аснове гэтага і ўзніклі ўяўленні аб рэінпарнацыі (прынцып пераўвасабленняў). Тое, што мы прывыклі называць індывідуальнай свядомасцю, па сутнасці ёсць псіхалагічны працэс, накіраваны на адлюстраванне сусветнай свядомасці. Мы ж часцяком жывём на ўзроўні ўяўленняў, якія атрымліваем у выніку выхавання. Тыя ці іншыя словы выклікаюць у нас тыя ці іншыя ўяўленні. Звыкла думаючы так, мы лічым, што інакш і быць не можа. Так узнікаюць розныя праблемы — усяго толькі праява псіхалагічнай свядомасці, — але, тым не менш, менавіта яны і ёсць набытыя бар'еры на шляху да сапраўдных ведаў.

І. П. Шмялёў не прэтэндуе на ролю стваральніка нейкай сваёй тэорыі. Тое, аб чым ён гаварыў, па сутнасці не новае. Яго задача — звярнуць нас да сапраўдных ведаў, усе яго словы былі аргументаваны матэматычнымі разлікамі, фізічнымі формуламі. Ён жа ўсяго толькі архітэктар.

А калі нехта паставіць пад сумненне пробу залатога правіла гармоніі, падумайце, як правесці дыяганаль у крузе?

Запісала,
**Л. ЦІМОШЫК.**

ЯКРАЗ ДЛЯ ВАС

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА Ў ШКОЛЕ

***Часопіс «Беларуская мова і літаратура ў школе» яшчэ мала вядомы шырокаму чытачу, бо існуе толькі чацвёрты год і распаўсюджваецца ў асноўным па падпісцы. Але настаўнікі-філолагі рэспублікі з вялікай удзячнасцю штомесяц сустракаюць выхад яго новых нумароў.***

Часопіс мае наступныя традыцыйныя раздзелы:

**Школа і нацыянальнае адраджэнне** — у гэтым раздзеле друкуюцца артыкулы, у якіх асвятляецца ход нацыянальнага адраджэння, беларусізацыя школ, ідзе гаворка аб праблемах правапісу і г. д.

**Методыка і вопыт** — найбольш аб'ёмны раздзел, у ім друкуюцца матэрыялы да ўрокаў па беларускай мове і літаратуры, прычым з акцэнтам на творчае асэнсаванне вядомых палажэнняў. У гэтым годзе ўдзяляецца вялікая ўвага творчым працамм вучняў на ўроках мовы (сачыненні, разважанні, апісанні і г. д.), новаму прачытанню класічных твораў.

**Філалогія** — у гэтым раздзеле змяшчаюцца арыгінальныя навуковыя артыкулы па мовазнаўстве, літаратуразнаўстве, адкрываюцца раней невядомыя старонкі літаратурнай спадчыны.

**Калі закончыўся ўрок** — раздзел, у якім можна знайсці матэрыялы для пазакласнай работы з вучнямі (віктарыны, работа гурткоў, вечарыны).

**Культура Беларусі** — раздзел для тых, хто цікавіцца культурай Беларусі, праблемамі вывучэння духоўнай спадчыны на школьных уроках.

**Міжпрадметныя сувязі** — у гэтым раздзеле знойдуць шмат цікавага для сябе і гісторыкі, настаўнікі іншых спецыяльнасцей, якія творча падыходзяць да правядзення ўрокаў.

Часопіс «Беларуская мова і літаратура» параўнальна танны — 7 руб. 20 кап. Сабекошт яго значна вышэйшы, але выдаткі кампенсуюцца Міністэрствам народнай адукацыі БССР, органам якога з'яўляецца часопіс.

Часопіс будзе карысным усім, хто працуе ў сферы народнай адукацыі або толькі рыхтуецца стаць настаўнікам беларускай школы. Як вядома, перш чым навучаць — трэба навучыцца самому. «Беларуская мова і літаратура ў школе» дапамагае настаўніку стаць прафесіяналам у сваёй справе.

У верасноўскім нумары чытачоў часопіса чакае прыемны сюрпрыз: упершыню ён выходзіць з каляровымі ўклейкамі. На слайдах — славутыя помнікі беларускай архітэктуры, жывапісныя партрэты Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча. Часопіс прапануе настаўнікам выкарыстаць гэтыя ілюстрацыі на ўроках для напісання вучнямі творчых работ. Аб тым, як гэта рабіць, распавядаецца ў матэрыялах настаўніка М. Касцяна, мастацтвазнаўцы А. Атраховіч. Падаюцца прыклады апісання помнікаў, карцін, слоўнікі спецыяльных тэрмінаў. Прыўнесці на ўрокі мовы і літаратуры паболей творчасці, абудзіць цікавасць вучняў да гісторыі і культуры роднай зямлі, навучыць іх разумець творы мастацтва — такія мэты ў першую чаргу ставілі перад сабой усе, хто працаваў над гэтым тэматычным блокам часопіса. Цяпер — слова за настаўнікамі: ад іх водгукаў у немалой ступені залежыць, ці атрымае, нарэшце, часопіс статус ілюстраванага выдання.

У чарговым нумары працягваецца размова пра тое, якой быць беларускай нацыянальнай школе, расказваецца пра першы конкурс настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, які прайшоў на Гродзеншчыне. Друкуецца нарыс пра жыццё і творчасць «беларускага Дудара» Вінцука Дуніна-Марцінкевіча, заканчэнне літаратурнага партрэта Івана Чыгрынава.

Часопіс ушаноўвае два юбілеі — 60-годдзе Ніла Гілевіча (змешчана інтэрв'ю з ім) і 100-годдзе з дня першага выдання кнігі «Дудка Беларуская» Францішка Багушэвіча.

Пад рубрыкай «У вянок Максіму» на гэты раз падаецца цікавы матэрыял пра Ніжні Ноўгарад у лёсе Максіма Багдановіча. Паэт-песеннік Сяргей Новік-Пяюн дзеліцца ўспамінамі, якія падсвечваюць літаратурную спадчыну Якуба Коласа.

Часопіс знаёміць чытачоў з планамі на будучы год і просіць сваіх сяброў не забыцца аформіць падпіску.

**Іван ЖДАНОВІЧ,**
адказны сакратар рэдакцыі часопіса.
Тэл. 23-07-40.

АПЕРАЦЫЯ «БУЛЬБА»

# РАБСІЛА ПА РЫНАЧНАЙ ЦАНЕ

**Саўгас «Карпавічы», дзе працуюць студэнты чацвёртага курса гістфака, знаходзіцца ў Вілейскім раёне і нічым адметным ад іншых, на мой погляд, не адрозніваецца. Таму на яго прыкладзе можна ўявіць умовы жыцця і працы [illegible] студэнтаў.**

Як вядома, адносіны па[illegible] і яго намочнікамі замацаваны ў дагаворы, які пр[illegible] забеспячэнне жыллём, працай, харчаваннем і, па [illegible]чымасцей, культурнымі мерапрыемствамі. Што датычыцца першага і другога, то тут нараканняў амаль што няма: жывуць на кватэрах па два-тры чалавекі, норма выпрацоўкі зніжана на 20 працэнтаў; а вось з харчаваннем...

Уся загваздка ў тым, што прадукты харчавання падаражалі ў тры-чатыры разы, а расцэнкі за збор бульбы падняліся толькі ў 1,8—2. Дзённага заробку ледзь-ледзь хапае на тое, каб разлічыцца за харчаванне. Да таго ж, высветлілася, што ў сталовай на сняданак даюць учарашнія стравы, ды яшчэ і аблічваюць. Атрымлівалася, згодна гэтым падлікам, што ў час абеду студэнты з'ядаюць па сто грамаў масла кожны, а на снеданні — замест адной стравы дзве, а то і тры. Цяпер правяраецца амаль што кожная ведамасць...

Але ж галоўнае, дзеля чаго прыехалі студэнты, гэта, вядома, не харчавацца і адпачываць, а дапамагаць.

Уявіце сабе поле велічынёй з плошчу Леніна ў Мінску, на якім працуюць, акрамя гісторыкаў, навучэнцы тэхнікума (іх разоў у пяць болей, чым студэнтаў). Хутка студэнты паедуць дадому, бо засталося сабраць бульбу з апошняга поля. А гэта працы на нейкі тыдзень пры добрым надвор'і. Вось мне і падумалася, што не надта патрэбнымі яны тут былі. Калі ўлічваць, што норму рэдка ўдаецца выконваць, а саўгас абяцае заплаціць 50 працэнтаў са сваёй кішэні за харчаванне, акрамя таго, яшчэ плаціць за кожнага студэнта універсітэту. Каму выгадна запрашаць такую колькасць людзей? На мой погляд, трэба было яшчэ да пачатку восеньскіх сельскагаспадарчых работ падлічыць прыкладна патрэбную працоўную сілу, а тады ўжо рабіць заказ на яе.

**І. ДУБНІК,**
студэнтка факультэта журналістыкі.



# Віктар ЦОЙ

# ЧАМУ МЫ ТАК МОЦНА ЯГО ЛЮБІЛІ?

*Здаецца, я застаўся ў даўгу — з-за таго, што мог, але больш так і не сустракаўся з Віктарам Цоем. Такое ў мяне адчуванне. Таму я зноў еду ў Санкт-Пецярбург, размаўляю з бацькамі Віктара, Марыянай, Сашкай, мамай Марыяны — Інай Мікалаеўнай Голубевай, шукаю сяброў Цоя...*

## Бацька: «Я заахвочваў яго самастойнасць»

— **Роберт Максімавіч, вашы продкі — выхадцы з Карэі?**

— Так. Яшчэ дзед эміграваў у Савецкі Саюз, бо ўдзельнічаў у барацьбе супраць дыктатара Лі Сын Мана. Але ў 37-м Сталін інтэрніраваў карэйцаў з Усходу па ўсёй краіне.

— **Імя Віктару прыдумалі вы? Чаму менавіта гэта імя?**

— У 60-я гады ва ўсіх у галовах былі адны і тыя ж імёны. А Віктар — імя рэдкае тады.

— **Як складваліся ў вас адносіны з сынам?**

— У нас былі сяброўскія адносіны. Я заахвочваў яго самастойнасць. І думаю, менавіта таму ён стаў лідэрам.

## Мама Віктара: «Я хачу ведаць усё аб сваім дзіцяці»

— **Валянціна Васільеўна, на ваш погляд, што садзейнічала развіццю творчых здольнасцей Віктара?**

— У нейкай ступені я ведаю адказ на гэта пытанне. Але наогул аб гэтым можна толькі здагадвацца.

Віця рана пачаў маляваць, а я яго малюнкі развешвала на сцены, каб яны не былі голыя. І суседзі таварылі: ён у вас добра малюе. Аднак я не звяртала на гэта ўвагі, бо дарослыя любяць хваліць дзяцей. Але калі ў дзіцячым садку яму падарылі кніжачку са словамі «наш мастак», мяне гэта ўразіла.

Мы пайшлі ў Дом піянераў і школьнікаў. Але пакуль ён дзве гадзіны займаўся там, трэба было яго чакаць. Я ж ніяк не магла! Кінулі. А з усіх бакоў кажуць: «Яму трэба займацца!» Хацела аддаць яго ў інтэрнат для мастацкі адораных дзяцей — там прымаюць толькі іншагародніх. А ленінградцаў трэба было прывозіць. Ну, гэта мне зноў не падыходзіць! І я вырашыла: калі ёсць талент, ён нікуды не дзенецца!..

У чацвёртым класе ён стаў ездзіць у студыю выяўленчага мастацтва Палаца піянераў імя Жданава. І аднойчы на сходзе студыі яе кіраўнік, не педагог, а мастак па адукацыі, з трыццаці рабят назваў самых-самых. І другім — Віцю. Ён сказаў, што яго нельга прымушаць нешта рабіць, бо гэта пустое — калі захоча, будзе сам рабіць. Я, зразумела, душой расквітнела. Пасля такой адзнакі яго ж можна ўжо на-



зваць таленавітым хлопчыкам... Хадзіў ён у гэту студыю год. А ў пятым класе перайшоў у мастацкую школу. І неяк запрасіў мяне з Робертам на гарадскую выстаўку, на якой ён тады заняў другое месца за малюнак «Усе на БАМ», на якім паказаў маладых людзей з гітарамі і ў вагонах. А выстаўка наогул была аб Радзіме. Але чаму ён перамог? — таму што гэта было пападанне ў той час. Пасля заканчэння школы Віця паступіў у Сяроўскае вучылішча на афарміцельскае аддзяленне. Але яшчэ ў восьмым класе арганізаваў ансамбль. Вучоба ў яго неяк не ішла: у галаве ў асноўным была толькі музыка. На другім курсе ўвесь ансамбль з вучылішча выгналі. Віцю праз камісію па справах непаўналетніх накіравалі ў вячэрнюю школу. Але яго 70 рублёў, якія ён зарабляў, мне не патрэбны былі. Я хацела, каб ён не губляў мастацкія навыкі. І забрала яго з работы, сказаўшы: «Чытай і малюй».

Пасля дзесяцігодкі ён паступаў у тэатральны на лялечніка, але не прайшоў. У выніку паступіў у ПТВ на рэзчыка па дрэве. Аднак і там арганізаваў ансамбль. І тады ж сустрэўся з Грабеншчыковым. Пачаліся фестывалі... ПТВ скончыў толькі з даведкай. Працаваў у рэстаўрацыйнай майстэрні Екацерынінскага палаца. Але яму там не падабалася. Таму перайшоў у майстэрню пры выканкоме — працаваў у Смольным, на раманаўскай дачы (Г. В. Раманаў — член Палітбюро ЦК КПСС, член Прэзідыума ВС СССР у той час.— С. Ш.).

Чаму ён узняўся вышэй за многіх?.. Віця — метыс: Роберт — з поўдня, я — паўночная. А вядома: калі скрыжоўваць, скажам, амерыканскую пшаніцу з якой-небудзь нашай, то атрымліваюцца высокаякасныя гатункі. І тут тое ж самае. Да таго ж, калі Віця пайшоў у школу, я сябравала з бібліятэкарам, якая давала яму кнігі — дыяменты дзіцячай літаратуры! І ён чытаў іх з задавальненнем. Я не прымушала яго гэта рабіць. Але ж чытанне вельмі важнае для выхавання душы.

Аднак мастацкай адукацыі ў яго не атрымалася. Чаму? Таму што ён не сустрэў ніводнай моцнай асобы! А музыка? Я думала — пайграе і кіне. Але ён сустрэў Грабеншчыкова. А гэта натура інтэлектуальная і валявая. Яны пасябравалі. Грабеншчыкоў нават быў сведкай на вяселлі ў Віці і Марыяны. Думаю, калі б Віця сустрэў цікавага мастака, ён і стаў бы мастаком. У яго ж няма музычнай адукацыі!

У нас усё будавалася на даверы. З кім-небудзь я магу і лаяцца, а з гэтым дзіцём, якога я страшэнна любіла, вырашала ўсе пытанні мірна. Ён мог прыйсці дадому позна. Я яму толькі казала: «Віця, ты мне толькі пазвані і можаш заставацца начаваць там, дзе зараз знаходзішся». І не было выпадку, каб ён не пазваніў. Я вельмі баялася начнога горада. Віця расказваў, што падыходзяць хлопцы і патрабуюць грошы. І ў яго яны заўсёды былі — ён аддаваў іх. Бо за 20 капеек маглі ж проста знявечыць! А ён не любіў біцца. Спортам Віця не займаўся. Справа ў тым, што ў яго не было да гэтага цягі. Да таго ж заняткі ў мастацкай школе давалі вельмі вялікую нагрузку: я берагла яго мастацкую лінію. Час, калі ён заняўся і тэнісам, і барацьбой, прыйшоў пазней.

— **Ці гуляў ён у двары з хлопчыкамі?**

— Так! Па памыйках лазіў! Прыйдзе — брудны-брудны! Але я з яго чысцёху не рабіла. Не падабаюцца мне залізаныя і чысценькія хлопчыкі.

— **Ён часта ўлюбляўся?**

— Дзяўчынкі званілі яму часта. Але ён ні з адной не знаёміў. І першай прывёў Марыяну. Яму было 20 гадоў. Яны знялі кватэру. Я думала: можа, ён яшчэ расчаруецца? Але праз два гады яны распісаліся. У 85-м з'явіўся Саша. Віктар быў шчаслівы. Але, мабыць, кожная сям'я хварэе. Бачу — ён ужо нажыўся. А потым — пайшоў. Бывае... Аднак з Наташай ён ужо нас не знаёміў. Але потым ён зноў стаў пануры і цяжкі. Хаця заўсёды казаў: «Матуля, у мяне ўсё добра».

—— **Вы хадзілі з Робертам Максімавічам на яго канцэрты?**

— Так. Мне падабалася бачыць, як ён незалежна трымаў сябе. І мяне ўзрушвала цудоўная еднасць гледача з ім!

Паўсюль пішуць пра яго толькі добрыя словы. Гэта дзіўна, але ён сапраўды быў сябрам, духоўным бацькам ці настаўнікам (я проста не знаходжу дакладных слоў!) моладзі. Я, як маці, хачу ведаць усё аб сваім дзіцяці.

**ЧАМУ ЯНЫ ЯГО ТАК МОЦНА ЛЮБІЛІ?**

## Марыяна Цой: «У нас мэты ў жыцці не было, пакуль не з'явілася «Кіно»

**Марыяна — ленінградка ў чацвёртым пакаленні. Гучная і імпульсіўная, яна схіляе да натуральнасці.**

— **Марыяна, цябе называюць першым менеджэрам «Кіно». Раскажы крыху аб тым часе.**

— Калі я была з «Кіно», гэта было проста падпольнае боўтанне! Не існавала нічога афіцыйнага! Размовы аб сённяшнім адміністратарстве проста не ішло. І калі чалавек, глыбока ўлюбёны ў сваю справу і групу. Ён рабіў гэта на свой страх і рызыку. Бо маглі прыйсці абком, гарком і трыццаць тры камітэты і ўсё забараніць! Я толькі вяла перагаворы па тэлефоне. Ды й сам Віця быў цудоўным менеджэрам. Свае фінансавыя справы ён вёў сам. Проста мы гулялі ў свае цацкі — называлі сябе прыгожымі імёнамі, каб наша няшчаснае тады жыццё (з пункту гледжання тых праблем) было падобна на прыгожую птушку.

— **Ёсць меркаванне аб «зорнай хваробе» Віктара, якая, магчыма, паслужыла штуршком да такога трагічнага ўспрымання жыцця ў апошні час.**

— Грамадская думка вельмі згусціла яго «зорную хваробу». Цой быў чалавекам замкнёным. І вялікая колькасць канцэртаў уплывала на яго



цяжка. Ён заўсёды збягаў у гэту Латвію! Ён прыязджаў за Саней на адзін дзень, і ўвечары яны ўжо ляцелі. І — да верасня. Можа, яго нежаданне ісці на многія кантакты, на якія яго так правакавалі, і назвалі «зорнай хваробай»?

— **Валянціна Васільеўна на сваё пытанне: «Што ты будзеш рабіць, калі твая папулярнасць скончыцца?» — пачула: «Буду пісаць тэксты».**

— Віктара, я думаю, хапіла б на ўсё. Калі ў чалавека ёсць дар божы, што б ён ні рабіў, ён усё роўна знойдзе сябе. І Віця быў спакойны наконт гэтага — я б ніколі не спыталася ў яго так!

— **Чым, на мой погляд, прывабны Цой для тысяч хлопчыкаў і дзяўчынак — дык гэта сваёй незалежнасцю:** ... цыгарэт і білет на ...лёт — вось і ўсё, здаецца, што ёсць у героя яго песень. Ну, а наколькі гэты вобраз суадносіцца з самім Віктарам? У яго жыцці ўсё сапраўды было так, ці ён сам толькі жадаў гэтай, скажам так, свабоды духа?

— Ён ніколі асабліва не любіў ездзіць проста так, як, напрыклад, Башлачоў — перакаці-поле. Віця любіў бываць дома. Але я думаю, прываблівае нават не гэта, а тое, што ён у іх пустое боўтанне ўнёс долю рамантызму, асэнсаванасць. У нас мэты ў жыцці не было, пакуль не з'явілася «Кіно». Віця апраўдаў мноства людзей у асабістых пошуках. У Цоі знайшлі сябе вельмі многія падлеткі нашай велізарнай радзімы, у якой чорт ведае што адбываецца і дзецьмі ніхто не займаецца. Ён стаў настаўнікам, мабыць, для іх...

У 1987 годзе Віктар і Марыяна разышліся. Апошнія гады Цой жыў з Наташай. Яна з Масквы. Я прашу прабачэння ў Марыяны, але звяртаюся з просьбай удакладніць: яны не былі разведзены. У адказ яна паказвае ленінградскую «Смену»: «Напішы, як тут, бо гэта праўда». Я пішу:

«— **Я ў некаторых публікацыях сустракаў такія словы: «Жонка Наташа». Як гэта разумець?**

—... Гэта таму, што ў нас у савецкім лексіконе для жанчыны, якая (у добрым сэнсе слова) не афармлена афіцыйным шлюбам, няма нармальнага слова. «Сяброўка» — гэта адразу маецца на ўвазе нешта «такое». І ў людзей, якія добра ставяцца да Наталлі, проста рука не падымецца інакш напісаць. Мяне гэта не крыўдзіць. Калі б Віця хацеў, каб гэта фраза не прагучала, ён і зрабіў бы ўсё неяк інакш. Наталлю ўсе ведалі, яна прысутнічала на ўсіх канцэртах, у Ленінград прыязджала. Ён нас пазнаёміў задоўга да трагічных падзей, спецыяльна пазнаёміў, каб для ўсялякай закуліснай драбязы не была наша сустрэча прынадным кавалкам. Іншая справа, што мы з ёй практычна не мелі ніякіх зносін: у нас быў бар'ер, які адразу знік, калі Віця загінуў».

## Цаёнак Сашка

Іх сыну — шэсць гадоў. Марыяна гаворыць пра яго: «Гэта, здаецца, асобная ў маім жыцці будзе гісторыя. Ён такога кровазмяшэння — у мяне ж таксама намешана процьма крывей. Максімум часу, што ён можа правесці на крэсле,— дзве хвіліны. Любіць усё адразу і ў вялікай колькасці, малюе цудоўныя карціны, тут жа іграе на бадмінтоннай ракетцы (як на гітары), спявае, прычым у яго вырываюцца фразы і рыкашэтаўскія (з «Аб'екта насмешак»), і бацькоўскія, і БГ — усё фантанам. Захапляецца фільмамі пра Рэмба, «Бэтмэн», часта ўспамінае бацьку, мы часта раімся з Саней, перад тым як зрабіць нейкі крок, заўсёды пасядзім-падумаем: як бацька паглядзеў бы на гэта?»



Хлопчык сапраўды вельмі жывы. Я пытаюся ў яго пра бацьку. І ў адказ:

— Яго ў жывых няма, таму мне, не ведаю чаму, але вельмі шкада яго. І калі аб гэтым пытаюцца хлопчыкі і дзяўчынкі, я нават часам не магу гаварыць пра гэта!

— **Як бацька называў цябе?**

— Цаёнак.

— **Што табе падабалася ў ім?**

— Тое, што ён мяне вельмі любіў.

У першую гадавіну на Багаслоўскіх могілках устанавілі помнік на магіле Віктар Цоя, прайшлі канцэрты яго памяці, спазнілася з выхадам кніга пра яго...

**Сяргей ШАПРАН**

## Віктар ЦОЙ

*А НА ЗАКАНЧЭННЕ— СЛОВА ВІКТАРУ. ВЕРШЫ ПЕРАДАДЗЕНЫЯ МАРЫЯНАЙ НАШАМУ КАРЭСПАНДЭНТУ, ДРУКУЮЦЦА ЎПЕРШЫНЮ.*

Я на запотевшем стекле
трамвая
Пальцем рисую плохие слова.
Кругом водосточные трубы
играют,
И мокра от дождя, как
на клумбе трава, голова.

И город вдруг сразу стал
серым и мокрым.
Я шагаю, не прячась
под сенью зонтов.
И блестят от дождя словно
зеркальца стекла.
Я готов зайти в гости в любой
из ближайших домов.

Поколение «Х»,
поколение «О».
Мы странны, нас узнать
можно с первого взгляда.
Мы забыли про боль,
перекатная голь.
Я не знаю, кому из нас здесь
еще что-нибудь надо.

Уже капает с крыш и на
улице — плюс.
И прошел первый дождь,
и весна так близка.
Все не так уж плохо, если
ты улыбнешься.
И мы вместе посмотрим на
мир сквозь стакан сушняка.

* * *

Я смотрю в окно на грустный
бал зимы.
Деревья без листьев, долгая
ночь.
С каждым днем труднее
помнить лето.
Эти дни не могут мне помочь.

Мертвое тепло в железе
батарей.
Мерзлые цветы на рынках
плачут.
Каждый вечер хочется быть
дома.
Эти дни не могут много
значить.

Первый снег красив, но он —
несущий смерть.
Голуби сидят на люках
жизни.
И в это время больше хочется
тепла.
Я сижу и жду свою весну.
1983

# ДЛЯ ЦЯБЕ

БУДУ ЖАНІЦЦА!

## НАВОШТА ВЯСЕЛЛЮ ГОРЫЧ?

**Якім быць нашаму вяселлю? Ліхаманкава перабіраць варыянты я пачала ў той самы момант, калі будучы муж зрабіў мне прапанову. І, як прынята, кінулася на дапамогу за замужных прыяцелек. Адна з іх гадзінамі магла дзяліцца горкім вопытам здабывання вясельнага ўбору і заручальных пярсцёнкаў. Другая лаканічна прызналася: «Па-мойму, усе нядрэнна весяліліся б і без нас». І гэта ўсё, што засталося? На іх месцы я назаўсёды выкрасліла б гэты дзень з памяці, а ў кожную гадавіну шкадавала б аб тым, што вяселле ў жыцці толькі раз. Ну ўжо не! І няхай маё жаданне грамадскасць палічыць эгаістычным, на ўласным вяселлі я не збіраюся задумвацца аб пляткарстве ўсюдыісных дваровых кумак, а тым больш асуджаць сябе на лёс лішняй на свяце сваякоў і знаёмых.**



І мы задумалі начны баль-маскарад...

Ведаеце, самае абдзеленае з трох апошніх пакаленняў — наша, бо не атрымала ў спадчыну старых абрадаў і інфантыльна чакае, пакуль нейкай фантазіяй будуць народжаны новыя. Вы, вядома, жадаеце і ў састарэлым узросце ўспамінаць з удзячнасцю дзень заключэння вашага шлюбу? Тады пакіньце марныя спадзяванні на спрактыкаванасць тых, хто наладжвае падобныя ўрачыстасці, і тварыце самі.

Нашы продкі вельмі справядліва лічылі вяселле другой па значнасці падзеяй у жыцці чалавека пасля нараджэння. Яны аддавалі даніну Богу шлюбу, верылі ў магію слова і рытуалаў. Вось здзівілася б маці сучаснай нявесты, калі б даведалася, што ад яе ўмення трымацца на пячным зрубе, ды яшчэ ўмудраючыся плесці кошык або займацца рукадзеллем залежыць шчасце дачкі. Бо толькі пасля гэтага ды яшчэ са згоды Бога продка, які жыў у печы, прыняць у ахвяру два хлябцы, адкрывалася вяселле ў паўночных абласцях Беларусі. І толькі пасля выканання ўсіх этапаў: «пярэпыты», «сватанне», «заручыны», «вяночкі», «елачка», выпечка каравая, тры дні вяселля, «цыганы», «госці» — вяселле лічылася закончаным. Гэтаму абраду надавалася куды больш значэння, чым вянчанню.

У народзе заканадаўчым рытуалам лічылася, калі на вачах усяго роду жаніха і нявесту «зводзілі да пары».

«Продаж нявесты», які раней меў практычнае значэнне — сваты выкуплялі пасаг, пасцель, падушкі, — сёння можа стаць слоўным спаборніцтвам жаніха і яго сватоў з сяброўкамі нявесты. Ды і абрад «умыканне», калі сваякі нявесты пасылалі атрад узброеных воінаў да дома «выкрадальніка», можна наладзіць як жартоўнае сілавое спаборніцтва гасцей.

Вяселле нярэдка працягвалася больш за тыдзень. І пасля дзяльбы каравая сваякі жаніха і нявесты хадзілі адзін да аднаго ў госці. Знаёміліся, абменьваліся невялікімі падарункамі. Так заканчваўся вясельны абрад.

Але ж у вашых сілах стварыць новы. Якім быць вашаму вяселлю? Прыдумайце самі. Адкрыю толькі невялікі сакрэт. Хутка два гады, як існуе наша першая сямейная традыцыя. Калі за руціннымі буднямі знікае свята, мы адкрываем апошнюю старонку сямейнага альбома і наведваем баль-маскарад.

**Марына МІКАЛАЕВА.**

ПСІХАЛАГІЧНЫ ПРАКТЫКУМ

*Амерыканскі псіхіятр Самуэль Дэнкель устанавіў залежнасць паміж позай, у якой спіць чалавек, і яго характарам.*

## Скажы мне, як ты спіш...

Тых, хто спіць «калачыкам», ён называе «бутонамі» — гэта людзі, якія падсвядома не жадаюць развітвацца са сваім дзяцінствам. Яны адчуваюць патрэбу ў апякунстве чалавека з моцным характарам. Пазбягаюць адказнасці і аднолькава схільныя як да дурнога, так і да добрага ўплыву. Гэта чуллівыя, імпульсіўныя натуры, якія кіруюцца ў сваіх учынках больш мінутным настроем, чым разумным сэнсам.

Тыя, хто спіць на жываце, падагнуўшы адну нагу, звычайна ўпэўненыя ў сабе, пунктуальныя, паслядоўныя ў сваіх меркаваннях, любяць парадак. Не церпяць нечаканасцей, разважлівыя, прадбачлівыя. Любяць навязваць сваё меркаванне, камандаваць, кіраваць.

Тыя, хто спіць на спіне, заклаўшы рукі за галаву, таварыскія, сардэчныя і добрыя. Яны ведаюць пра свае недахопы, але лічаць, што лепш не думаць пра іх і не змагацца з імі. Гэта людзі светлага розуму, яны пасяброўску ставяцца да тых, хто навокал, і прымаюць свет і людзей такімі, якія яны ёсць, што ў немалой ступені абумоўлена жаданнем не ўскладняць сабе жыццё. З такімі людзьмі лёгка мець зносіны, яны без цяжкасцей уваходзяць у любую кампанію, не канфліктуюць на рабоце і дома.

Тыя, хто спіць на спіне, як заўважыў С. Дэнкель, у дзяцінстве былі любімцамі сваіх бацькоў. Іх можна назваць пестунамі лёсу.

Тыя, хто спіць на баку, крыху падагнуўшы калені, — людзі ўраўнаважаныя, памяркоўныя. Яны рэдка ідуць на канфлікт, схільныя да разумных кампрамісаў. Яны без асаблівага напружання прыстасоўваюцца да розных жыццёвых умоў, бытавых цяжкасцей, знаходлівыя ў складаных жыццёвых сітуацыях. Аднак яны не валодаюць дастатковай смеласцю, энергіяй і настойлівасцю ў дасягненні мэты, не славалюбівыя, не імкнуцца да лідэрства ў грамадстве. Пераважна застаюцца ў цені, асабліва калі гэта цень паважаемага імі чалавека.



ХОЧАЦЕ — ПРАВЕРЦЕ

## Вашы рукі — таямніца

**Многія працягваюць лічыць хірамантыю шарлатанствам. А яна ў той жа час застаецца адной з самых старажытных навук, якая ўзнікла амаль разам з чалавечай цывілізацыяй. У перакладзе з грэчаскай мовы слова «хірамантыя» — «рука» і «варажба», «прароцтва». Тым, хто прызнае за хірамантыяй навуку, якая дапамагае прадказаць па форме рук, пальцаў, нагцей і лініях, малюнках на далоні асаблівасці характару, душэўных якасцей, схільнасцей, стан здароўя чалавека, будучыя зменлівасці [illegible] лёсу.**

Пагля[illegible]-новаму на свае рукі! [illegible] колеру скуры на іх. Кал[illegible]овы, прыемны, гэта сведч[illegible]ць аб здароўі чалавека і дабрыні яго характару. Калі скура мае схільнасць чырванець, гэта прыкмета моцнай узбудлівасці і ўражлівасці асобы. Чым больш інтэнсіўная афарбоўка скуры рук, тым больш эмацыянальны, актыўны іх уладальнік і тым больш ён схільны да выбухаў гневу і раздражнення. Бледная скура рук сведчыць аб ўраўнаважаным характары, часам аб холаднасці і эгаізме. Жаўтаватая — аб схільнасці да меланхоліі і песімізму.

Не меншую ролю адыгрывае тэмпература рук. Цёплая рука — прыкмета здароўя, а ў спалучэнні з моцным поціскам, які ўласцівы яе ўладальніку, гаворыць аб лагодным характары. Заўсёды цёплая і сухая рука ўказвае на раздражнёнасць і неспакойны характар. Калі рука пастаянна халодная, гэта сведчыць аб нерашучасці і баязлівасці. Халодная і вільготная рука — апатычны характар. Простая і шурпатая ад прыроды скура рук дазваляе дапусціць у асобе вялікую жыццёвую сілу, ён — матэрыяліст.

Калі памеры рук прапарцыянальныя да другіх частак цела, гэта паказчык даволі ўраўнаважанага характару; калі ж прысутнічае яўная дыспрапорцыя (вельмі маленькія ці вялікія рукі), чалавек можа валодаць няўстойлівым характарам, нават мець схільнасць да дрэнных звычак.,

Вялікая рука — прыкмета дабрадушнасці і ўмення прыстасоўвацца да абставін. Вялікая, доўгая, сухая, вузлаватая рука з тупымі канцамі пальцаў указвае на дасціпнасць. У жанчын гэта можа сведчыць таксама аб прагнасці, схільнасці да пустэльніцкага вобразу жыцця. Вялікая, поўная кісць — прыкмета таго, што яе ўладальнік адрозніваецца дабрадушнасцю і міласэрнасцю, хаця пры сярэднім, з часам і вельмі развітым розуме мае слаба развітае пачуццё гумару. Вялікая, шырокая і мяккая рука з лапатападобнымі пальцамі бывае ў людзей, якія любяць назіраць як працуюць іншыя, у той час як самі яны аддаюць перавагу гультайству. Яны, як правіла, неабыякавыя да відовішчаў. Вялікая, тоўстая і грубая кісць — схільнасць да меланхоліі, практычнасці, а таксама прыкмета нехлямяжасці.

Сярэдніх памераў хударлявая кісць, асабліва калі яна вільготная, — тонкі розум. Тоўстая і грубая рука сярэдніх памераў — прыкмета бесталковасці.

Маленькая рука ў большасці выпадкаў — прыкмета гонару, самаўзвышэння і раздражнёнасці. Маленькая, поўная і вільготная кісць указвае на чалавека энергічнага, кемлівага, дабрадушнага з некаторым адценнем наіўнасці, самалюбівага і сумленнага. Маленькая крыху вільготная рука з вельмі кароткімі нагцямі і першымі суставамі пальцаў характарызуе чалавека хітрага, падазронага, прагнага, злога.

Кароткая кісць — прыкмета схільнасці меркаваць пра ўсё па першым уражанні. Вельмі хударлявая, тонкая і пяшчотная кісць указвае на натуру слабую і няплённую, якая валодае фантазіяй, з вялікімі патрэбамі, якія чалавек не здольны рэалізаваць. Калі кісць хударлявая, але валодае памерамі, прапарцыянальнымі ўсяму целу, гэта гаворыць аб ясным і жывым розуме. Калі кісць хударлявая і рухомая, гэта сведчанне яскравага інтэлекту яе ўладальніка.

Пругкая і гнуткая кісць служыць звычайна паказчыкам уражлівасці, схільнасць да сузірання і вялікіх здольнасцей. Вузлаватая кісць з добра развітымі звязкамі — схільнасць да парадку, упэўненасць у сваіх сілах і ўменне дасягаць поспеху. Прыгожая, вытанчаная кісць з доўгімі, тонкімі пальцамі і з вельмі доўгімі нагцямі міндалепадобнай формы звычайна належыць чуллівым і летуценным людзям, рамантычным, але не здольным да практычнага жыцця.

Квадратная кісць з квадратнымі пальцамі (як у асновы, так і на канцах) і з квадратнымі кароткімі нагцямі можа належыць працаўніку, які адрозніваецца вялікай упартасцю ў дасягненні мэты, схільны да вывучэння дакладных навук, здольны да шчырасці пачуццяў. Але гэта гаворыць таксама аб недаверлівасці і аб адсутнасці схільнасці да духоўнага жыцця.

Калі форма кісці нагадвае трохвугольнік — няроўная і завостраная, без вузлаватасці на пальцах, — такая рука належыць рамантычнаму, імпульсіўнаму чалавеку з яскравай мастацкай адоранасцю. Яна характарызуе чалавека, які прагне поўнай свабоды, які адрозніваецца непастаянствам у каханні і сяброўстве.

Вельмі важна, кісць мяккая ці жорсткая навобмацак, асабліва калі жорсткасць прыроджаная, а не з'явілася пад уплывам старасці. На мяккіх руках невялікія мясістыя падушачкі ўнутраных паверхнях канцоў пальцаў звычайна больш развіты, чым на жорсткіх, таму людзі з мяккімі рукамі, на думку хірамантаў, больш уражлівыя і валодаюць больш тонкімі пачуццямі, чым людзі з жорсткімі рукамі. Наогул жа мяккія рукі ўказваюць на бестурботнасць, ляноту, абмежаваны розум, падатлівы і нетаварыскі характар, сведчаць аб слабасці да мішуры, аб пяшчотнасці ў каханні пры павярхоўнасці пачуццяў. Такія людзі аддаюць перавагу жыццю ў марах, а не ва ўмовах рэальнасці.

Мяккія, бязвольныя, халодныя рукі, якія рэагуюць на поціск як «вараная рыба», сведчаць аб флегматычнасці, неэмацыянальнасці; мяккія, слабыя рукі прыкмета вяласці, ляноты і непрыстасаванасці да працы; мяккія, мясістыя рукі з гладкай скурай заключаюць усе папярэднія асаблівасці, толькі ў пераважнай ступені, да таго ж указваюць на людзей, якія любяць добра паесці; рукі незвычайны тоўстыя і шырокія, мясістыя, служаць прыкметай грубасці і жывёльных інстынктаў.

(Працяг у наступным нумары).

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

19 верасня
Зак. 2072.
Т. 1000 экз.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.